Канстанцін БАНДАРЭНКА

# «Русское собрание» і яго Віленскі аддзел
## у гады першай рускай рэвалюцыі

Ідэйныя асновы стварэння крайне правых манархісцкіх партый бяруць свае вытокі з таварыстваў памешчыкаў, якія ўзніклі на мяжы XIX—XX стст. Першапачаткова яны аб'ядноўвалі артадаксальных прыхільнікаў самадзяржаўя і былі падобныя на клубы. Іх дзейнасць мела саслоўна-дваранскую афарбоўку і не прадвяшчала будучай рэакцыйнасці.

Першая легальная манархісцкая арганізацыя была створана ў кастрычніку—лістападзе 1900 г. у Пецярбургу пад назвай "Русское собрание". Статут яе быў зацверджаны таварышам (намеснікам) міністра ўнутраных спраў[1]. Асноўная мэта "Русского собрания", як адзначалася ў статуце, заключалася ў тым, каб "... содействовать выяснению, укреплению в общественном сознании и проведению в жизнь исконных творческих начал и бытовых особенностей русского народа"[2]. У якасці першачарговых задач арганізацыя ставіла вывучэнне мінулага і сучаснага рускага і славянскага народнага жыцця, народнай гаспадаркі, распрацоўку пытанняў рускай і славянскай славеснасці, мастацтва, ахову чысціні і правільнасці рускай мовы і інш. Напачатку дзейнасць "Русского собрания" мела культурна-асветніцкі характар з ухілам у бок нацыяналістычнага славянафільства. Планавалася нават узвесці спецыяльны будынак у традыцыях рускага дойлідства для размяшчэння "Русского собрания", у якім мелася ладзіць вечарыны, куды члены арганізацыі павінны былі прыходзіць у традыцыйнай рускай вопратцы.

На пачатку арганізацыя налічвала 120 чалавек. У лютым 1903 г. колькасць яе членаў, як адзначана ў выдадзеным у тым жа годзе афіцыйным друкаваным органе — часопісе "Известия Русского собрания", вырасла да 1 500 чалавек. Са студзеня 1906 г. пачала выдавацца штотыднёвая газета "Вестник Русского собрания", паводле звестак якой у арганізацыі налічваліся ўжо 2 300 членаў[3]. Кіраваў "Русским собранием" Галоўны савет з 17 чалавек, сярод якіх асабліва вылучаліся граф Н.Ф.Гейдэн, князь М.Н.Валконскі, Н.А.Энгельгарт, К.І.Вялічка, бесарабскі памешчык У.М.Пурышкевіч і інш. Членамі арганізацыі былі знакамітыя дваране, высокія армейскія чыны, вышэйшыя чыноўнікі і прадстаўнікі духавенства, вядомыя мастакі, музыканты, пісьменнікі.

У 1904—пачатку 1905 г., на думку сучасных расійскіх даследчыкаў, завяршаецца перыяд чыста культурна-асветніцкай працы гэтай арганізацыі русафільскай скіраванасці, і напярэдадні рэвалюцыі яна пераходзіць да палітычнай дзейнасці[4]. "Русское собрание" пачынае выступаць як палітычны клуб рускага манархізму, як кіраўнік усіх кансерватыўных сіл грамадства, якія імкнуліся адстаяць і захаваць у недатыкальнасці і непахіснасці арганізацыю і прынцыпы жыцця, што складваліся на працягу многіх вякоў і сфармуляваны ў вядомай трыядзе: праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць.



*БАНДАРЭНКА Канстанцін Міхайлавіч — кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1951 г. у в. Кучын Кармянскага р-на. У 1976 г. скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут імя А.А.Куляшова. Працаваў выкладчыкам, загадчыкам кафедраў гэтага інстытута. З 1992 г. — загадчык кафедры ўсходнеславянскай і расійскай гісторыі, з 2000 г. — рэктар Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова, з 2003 г. — рэктар Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова. Даследуе праблемы гісторыі палітычных партый і грамадска-палітычных рухаў Расіі і Беларусі.*

Пасля выхаду Маніфеста 17 кастрычніка 1905 г. арганізацыя апублікавала ў лістападзе сваю выбарчую праграму, у якой сцвярджалася, што самадзяржаўе не адмяняецца маніфестам, а Дзяржаўная дума не павінна нічога мяняць у асноўных законах. Яна можа толькі распрацоўваць і абмяркоўваць заканадаўчыя прапановы, а таксама ажыццяўляць нагляд за дзейнасцю выканаўчай улады. Імператар не нясе адказнасці за дзейнасць урада, праваслаўная царква захоўвае пануючае становішча ў краіне, руская мова з'яўляецца дзяржаўнай і г.д. Зварот да выбаршчыкаў заканчваўся шавіністычным заклікам: "Расія для рускіх". Выбарчая платформа "Русского собрания", як і яго статут, былі вытрыманы строга ў рамках тэорыі афіцыйнай народнасці (самадзяржаўе, праваслаўе, народнасць)[5].

31 снежня 1905 г. адбылася сустрэча прадстаўнікоў "Русского собрания" з імператарам Мікалаем II. У склад дэлегацыі ўваходзілі старшыня Галоўнага савета князь Д.П.Галіцын, таварыш старшыні камергер І.С.Лявонцеў, член савета камер-юнкер граф П.М.Апраксін і інш. З абодвух бакоў былі выказаны абяцанні поўнай  узаемнай падтрымкі[6].

"Русское собрание" мела перыферыйныя аддзелы ў 15 гарадах (Адэсе, Харкаве, Кіеве, Варшаве, Казані, Пермі і інш.). У гады першай рускай рэвалюцыі аддзел "Русского собрания" ствараецца і ў Вільні. Паводле даных Дэпартамента паліцыі МУС, яго адкрыццё супала па часе з асвячэннем помніка Кацярыне II (звесткі на пачатак 1906 г. — **К.Б.**)[7].

Стварэнне менавіта ў гэты час аддзела ў Вільні— прызнаным цэнтры беларускага культурнага жыцця — не было выпадковым.

Праваманархісцкія партыі, якія ўзніклі ў гады першай рускай рэвалюцыі, не раз адзначалі асобую ролю "Русского собрания" ў распрацоўцы праграмы, фарміраванні і кансалідацыі кансерватыўных сіл, іх арганізацыйным афармленні[8]. Сфера дзейнасці "Русского собрания" была даволі шырокая і разнастайная. Акрамя вырашэння адзначаных вышэй задач арганізацыя распрацоўвала выбарчыя платформы правых у час падрыхтоўкі і правядзення выбараў у Дзяржаўную думу, аказвала дапамогу ў падрыхтоўцы заканадаўчых актаў, праводзіла вялікую лекцыйна-прапагандысцкую работу, імкнулася актыўна супрацьстаяць дэструктыўным дзеянням левых партый, падтрымлівала намаганні, скіраваныя на збліжэнне славянскіх народаў, выступала ініцыятарам стварэння манархісцкіх саюзаў на ўскраінах імперыі і г.д. У Расіі ў гэты перыяд не было другой такой арганізацыі, якая акумуліравала б у сабе эліту і ідэалагічныя пастулаты агульнаімперскага манархісцкага руху.

Да нядаўняга часу пра дзейнасць "Русского собрания" ў беларускіх губернях пачатку XX ст. амаль што нічога не было вядома, за выключэннем рэдкіх упамінанняў у асобных выданнях пра існаванне яго аддзела ў Вільні. На наш погляд, гэта абумоўлена тым, што да канца 1990-х гг. гісторыя першай арганізацыі рускіх манархістаў па розных прычынах не стала прадметам спецыяльнага даследавання.

Першая манаграфія, прысвечаная "Русскому собранию", якая ахоплівае ўвесь перыяд яго існавання, з'явілася толькі ў 2003 г. у выдавецтве Расійскай палітычнай энцыклапедыі (РОССПЭН)[9]. Яе аўтар, вядомы рускі гісторык Ю.І.Кір'янаў, даследаваў архіўныя дакументы, сведчанні сучаснікаў падзей, перыёдыку і іншыя крыніцы таго часу, навуковую літаратуру канца XX—пачатку XXI ст. Аднак нават у гэтым грунтоўным даследаванні ёсць толькі фрагментарныя ўпамінанні пра дзейнасць "Русского собрания" на тэрыторыі Беларусі, і яны адносяцца да канстатацыі часу ўзнікнення яго Віленскага аддзела (1906 г. — **К.Б.**)[10]. У сваёй больш ранняй публікацыі дакументаў па гісторыі манархісцкага руху ў Расіі Ю.Кір'янаў адзначае, што ў матэрыялах Дэпартамента паліцыі за 1906 г. паведамляецца пра аддзел "Русского собрания" і яго кіраўнікоў у Вільні[11]. Аднак, паводле іншых звестак, аддзел "Русского собрания" ў Вільні быў створаны ў 1904 г.[12]. Праведзены намі аналіз выяўленых архіўных дакументаў і наяўнай навуковай літаратуры не дазваляе пакуль што зрабіць адназначны і канчатковы вывад пра час узнікнення Віленскага аддзела. Таму мы пагаджаемся з датай, прапанаванай Ю.Кір'янавым.

У Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі нам удалося адшукаць спіс членаў "Русского собрания" за 1906 г. У ім утрымліваюцца звесткі пра асоб, якія ўваходзілі ў склад Віленскага аддзела[13]. Аналіз гэтага спіса сведчыць, што большасць членаў — 37 чалавек — пражывала ў Вільні, там жа знаходзілася і кіраўніцтва аддзела. Два чалавекі жылі ў Мінску, 8 — у павятовых гарадах — Гомелі, Барысаве, Дзісне, Бабруйску, Ашмянах, Рагачове, 4 — у сельскай мясцовасці.

Аддзел меў сваіх членаў у Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губернях; не выяўлены яны ў Віцебскай губерні. Найбольш іх было ў Вільні і Віленскай губерні — 40 чалавек. У складзе Віленскага аддзела "Русского собрания" ў 1906 г. налічваўся, паводле нашых падлікаў, 51 чалавек[14]. Ад Магілёўскай губерні ў аддзел уваходзілі толькі чацвёра.

Колькасныя паказчыкі палітычных партый і саюзаў звычайна адлюстроўваюць не толькі маштабнасць іх дзейнасці, але і значэнне ў грамадскім руху. Аднак "Русское собрание" ў гэтых адносінах было выключэннем. Яно займала вядучае месца сярод іншых праваманархісцкіх арганізацый і было іх палітычным правадыром, своеасаблівым "мазгавым цэнтрам", хоць колькасць членаў арганізацыі наўрад ці перавышала 2,5 тыс. чалавек на ўсёй тэрыторыі Расійскай імперыі. У гэты ж час ва ўсіх крайніх правых партыях на канец 1907 г. налічвалася прыкладна 410 тыс. чалавек[15].

У шэрагу выпадкаў членства ў "Русском собрании" зводзілася ў асноўным да ідэйнай, матэрыяльнай і маральнай падтрымкі арганізацыі, да прапаганды і адстойвання ідэйных пазіцый правых на месцах. Таму афіцыйныя даныя пра колькасны стан арганізацыі і яе перыферыйных аддзелаў у розныя перыяды з'яўляюцца ў пэўнай ступені ўмоўнымі.

Грамадска-палітычнае значэнне "Русского собрания" заключалася ў "прывілеяваным" прафесійным і сацыяльным статусе яго членаў. Так, у Віленскім аддзеле найбольш значныя групы складалі цывільныя і ваенныя чыноўнікі (31,3%), а таксама прадстаўнікі так званага трэцяга саслоўя — выкладчыкі, пісьменнікі, журналісты, юрысты і тэхнічная інтэлігенцыя (41,1%). Памешчыкі-землеўладальнікі і афіцэры, што знаходзіліся на вайсковай службе, складалі 23,7 %. Даныя пра памешчыкаў, на наш погляд, не зусім дакладныя, паколькі ў агульным спісе прыводзяцца толькі род заняткаў і прафесія, а многія з тых, хто займаў высокія службовыя пасады, маглі адначасова быць і землеўладальнікамі, напрыклад, тыя ж павятовыя прадвадзіцелі дваранства. Сялянства было прадстаўлена толькі адным чалавекам, ды і той быў гандляр мясам у Бабруйску Мінскай губерні. Прафесія і род заняткаў 4 членаў аддзела невядомыя.

Спіс Віленскага аддзела сведчыць пра даволі высокі сацыяльны статус пераважнай большасці яго членаў: адзін чалавек меў чын тайнага саветніка, адзін — званне генерал-маёра, 8 — чын правадзейнага стацкага саветніка, што, згодна з законам ад 9 снежня 1856 г., які ўнёс змены ў Табель аб рангах (прыняты ў 1772 г.), замацоўвала за названымі катэгорыямі асоб права на патомнае дваранства. Чатырнаццаць чалавек са спіса з'яўляліся асабовымі дваранамі, з іх 5 чалавек мелі чын стацкага саветніка, 3 — калежскага саветніка, 3 — надворнага саветніка, 2 — калежскага асэсара. Пяць чалавек насілі званне "ганаровы грамадзянін", было 2 калежскія сакратары і 4 афіцэры[16].

Такім чынам, аналіз спісачнага складу Віленскага аддзела "Русского собрания" за 1906 г. сведчыць, што ва ўказаны час сярод яго членаў налічвалася 29 дваран — амаль што 57% ад агульнай колькасці. Прадстаўнікоў іншых саслоўяў былі адзінкі. Усё гэта пацвярджае той факт, што "Русское собрание" ў гады першай рускай рэвалюцыі складалася ў асноўным з "прывілеяваных" колаў грамадства.

Для ўступлення ў "Русское собрание" патрабавалася асабістая заява і паручыцельства двух членаў арганізацыі. Гадавы членскі ўзнос у 1905 г. складаў 10 рублёў, што раўнялася месячнаму заробку фабрычна-заводскага рабочага (у звычайнай правай партыі, у прыватнасці, у "Союзе русского народа", ён складаў 50 капеек). Напярэдадні Першай сусветнай вайны меркавалася павышэнне гадавога ўзносу ў 1,5 раза[17]. У сувязі з гэтым частка членаў арганізацыі аўтаматычна выбывала з яе складу за няўплату членскіх узносаў. Акрамя таго, членства часта насіла фармальны характар: статут не абавязваў строга выконваць рашэнні ці даручэнні кіруючых органаў партыі. Усё гэта негатыўна адбівалася на арганізацыйным і фінансавым становішчы арганізацыі і асабліва яе перыферыйных аддзелаў. Захавалася шмат дакументаў, у якіх утрымліваюцца просьбы кіраўнікоў аддзелаў на адрас Галоўнага савета "Русского собрания" пра выдзяленне грашовай дапамогі, а таксама распіскі пра атрыманне дапамогі ад прыватных асоб. Напрыклад, у распісцы старшыні Віленскага аддзела П.П.Шпота ад 24 кастрычніка 1906 г. напісана: "Я, нижеподписавшийся, сим удостоверяю, что сего числа мною получено от лиц, пожелавших остаться неизвестными, через Б.В.Никольского на нужды Виленского отдела Русского собрания триста (300) рублей"[18]. У далейшым акрамя фінансавых праблем з'явіўся яшчэ шэраг абставін, якія прывялі да змяншэння колькасці членаў аддзелаў і далейшага аслаблення арганізацыі.

Важнейшае значэнне для членства ў "Русском собрании" і яго мясцовых аддзелах, у тым ліку і Віленскім, было веравызнанне праваслаўя, хоць кіраўніцтва арганізацыі заяўляла, што манархісты з павагай ставяцца да прадстаўнікоў іншых канфесій. Тым не менш, калі яе мясцовыя структуры дапускалі магчымасць прыёму ў свой склад некаторых католікаў ці ісламістаў, Галоўны савет, які зацвярджаў праекты і дадаткі да іх статутаў, адкрыта выказваў пярэчанні і агаворкі. Асабліва жорстка ставілася кіраўніцтва да католікаў[19]. У нацыянальных адносінах Віленскі аддзел "Русского собрания" быў дастаткова аднародны, хоць у спісачным складзе акрамя велікаросаў, маларосаў і беларусаў (усіх іх манархісты лічылі "русскими людьми". — **К.Б.**), сустракаюцца прозвішчы, носьбіты якіх з вялікай доляй верагоднасці маглі быць праваслаўнымі палякамі, немцамі і нават яўрэямі (напрыклад, Кічнь, Магульскі, Пржэулаўскі, Рыхтэр, Тызенгаўзен, Ізенфлам, Ханкін і інш).

Тактыка "Русского собрания" і яго перыферыйных аддзелаў насіла кансерватыўны характар. Асноўнымі метадамі барацьбы за рэалізацыю праграмных і ідэалагічных установак былі агітацыйна-прапагандысцкая работа і ўдзел у выбарчых кампаніях у Дзяржаўную думу. Агітацыйна-прапагандысцкая дзейнасць Віленскага аддзела зводзілася ў асноўным да арганізацыі чытання лекцый для сваіх прыхільнікаў і распаўсюджвання друкаваных выданняў — часопіса "Известия Русского собрания" і газеты "Вестник Русского собрания". У матэрыялах асобага аддзела Дэпартамента паліцыі ёсць звесткі пра збор ахвяраванняў сярод жыхароў беларускіх губерняў на выданне і распаўсюджванне "Вестника Русского собрания". У адным з дакументаў гаворыцца пра паступленне грошай на гэтыя мэты ў суме 50 рублёў ад ігуменні Мсціслаўскага Тупіцкага манастыра Анатоліі[20].

Пасля абвяшчэння Маніфеста 17 кастрычніка 1905 г. кіраўніцтва галоўнага і мясцовых саветаў аддзелаў "Русского собрания" разгарнула актыўную дзейнасць па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў у Дзяржаўную думу. Аднак дамагчыся істотных поспехаў у выбарчых кампаніях 1906 і 1907 гг. манархістам не ўдалося. У "Наряде по секретным перепискам" Дэпартамента паліцыі ад 9 студзеня 1907 г. даецца агляд палітычнага становішча ў Віленскай губерні напярэдадні выбараў у II Дзяржаўную думу. У дакуменце падкрэслівалася, што насельніцтва Вільні (як мяшчане, так і інтэлігенцыя) падзяляецца

не па палітычных, а ў асноўным па нацыянальных партыях, найбольш уплывовая з якіх яўрэйская (сярод гараджан яўрэі складалі большасць). У "Наряде по секретным перепискам" гаварылася: "Руская партыя складаецца галоўным чынам са стараўераў, якімі кіруе купец — падрадчык Піменаў. Партыя дзейнічае заадно з "Русским собранием", крайніх тэндэнцый не праяўляе.., жадала б змены выбарчага закона і выдзялення ў Думе некалькіх месцаў прадстаўнікам рускага насельніцтва краю... Дваранства пераважна польскае. Рускае дваранства самастойна ніякай ролі адыграць не можа і, верагодна, пойдзе аб руку часткай з польскім дваранствам, часткай з мясцовым аддзелам "Русского собрания" (чыноўнікі), але значэння гэты аддзел мець не будзе"[21].

Прыведзены дакумент яшчэ раз сведчыць пра невысокі аўтарытэт віленскіх манархістаў у першых выбарчых кампаніях, што ў рэшце рэшт і пацвердзілі вынікі выбараў. У II Дзяржаўную думу ад Віленскай губерні былі абраны 7 дэпутатаў, сярод якіх не аказалася ніводнага прадстаўніка ад правых партый. Ад польскага кола ў думу прайшло 5 дэпутатаў, ад яўрэйскага — адзін і адзін дэпутат праваслаўнага веравызнання ад сялян[22].

Напярэдадні выбараў у III Дзяржаўную думу Віленскі аддзел "Русского собрания" меў непасрэднае дачыненне да аб'яднання манархісцкіх сіл Паўночна-Заходняга краю. Па ініцыятыве "Северо-Западного русского вече" (манархісцкая арганізацыя, створаная ў Вільні 25 снежня 1905 г., у сярэдзіне лютага 1906 г. налічвала ў сваіх радах каля 500 членаў. — **К.Б.**) з 7 да 9 кастрычніка 1906 г. у памяшканні аддзела "Русского собрания" адбыўся з'езд рускіх арганізацый заходніх губерняў Расійскай імперыі. У Вільню з'ехаліся дэлегацыі з Мінска, Віцебска, Гродна, Коўна, Варшавы, Прыбалтыйскага краю. Як адзначала манархісцкая газета "Окраины России", "съезд отличался редким для русских людей единодушием"[23]. У ходзе абмеркавання выбарчага заканадаўства была прынята прапанова "аднавіць хадайніцтва аб унясенні папраўак у правілы адносна выбараў у Дзяржаўную думу... Для гэтага закон змяняць няварта. Няхай толькі насельніцтва на ўскраінах будзе раздзелена на курыі: і ад рускіх, палякаў і яўрэяў будуць прадстаўнікі прапарцыянальна іх колькасці, прычым ад кожнага горада або губерні павінен быць рускі, хоць бы сярод насельніцтва было рускіх і менш за 250 тысяч выбарных". З мэтай аб'яднання ўсяго рускага насельніцтва заходніх ускраін на з'ездзе было вырашана стварыць "Русский окраинный союз" з аддзеламі ў Вільні, Мінску і мясцовымі аддзяленнямі пераважна ў прыходах[24].

Выбары ў III Дзяржаўную думу Віленскі аддзел "Русского собрания" правёў, паводле сведчанняў удзельнікаў тых падзей, больш арганізавана і выніkова. Адзін з заснавальнікаў і першы старшыня манархісцкай арганізацыі "Русское окраинное общество", якая была створана правымі 30 сакавіка 1908 г. у Пецярбургу, член Дзяржаўнага савета заслужаны прафесар М.Дз.Сяргееўскі ў жніўні 1908 г. наведаў Вільню, дзе сустракаўся з дзеячамі Віленскага аддзела "Русского собрания". Вынікам яго назірання стаў артыкул "Русское общественное собрание", апублікаваны ў газеце "Окраины России". Адзначаючы заслугі арганізацыі "ў рускай справе", аўтар падкрэсліваў, што яна была ачагом, "согревавшим и вдохновлявшим русских людей в дни предвыборной борьбы"[25]. У выніку ў III Дзяржаўную думу пры падтрымцы Віленскага аддзела былі абраны вядомыя правыя манархісты Г.Г.Замыслоўскі (дваранін, скончыў юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта, таварыш пракурора Гродзенскага акруговага суда, пасля в.а. таварыша пракурора Віленскай судовай палаты, надворны саветнік, член "Союза русского народа", з 1908 г. — "Русского народного союза Михаила Архангела") і А.С.Вяраксін (святар, член "Союза русского народа", затым "Русского народного союза Михаила Архангела")[26].

Члены Віленскага аддзела прымалі актыўны ўдзел у грамадскім жыцці па месцы жыхарства. Так, 8 кастрычніка 1906 г. у Мінску ў "Рускім грамадскім сходзе" пасля закрыцця агульнага пасяджэння "Минской группы внепартийных русских избирателей" адбылося пасяджэнне жаночага камітэта, створанага для прапаганды ідэй нацыяналізму. Старшынёй камітэта на гэтым пасяджэнні была абрана баранеса К.А.Тызенгаўзен, якая з'яўлялася членам Віленскага аддзела "Русского собрания"[27].

"Русское собрание" выступала ініцыятарам і ідэйным натхняльнікам аб'яднання ўсіх манархісцкіх сіл на тэрыторыі Расійскай імперыі. Пры яго непасрэдным удзеле ў гады першай рускай рэвалюцыі прайшлі чатыры аб'яднаўчыя з'езды рускіх манархістаў. Па прапанове "Русского собрания" І з'езд манархісцкіх партый і саюзаў адбыўся ў Пецярбургу 8—12 лютага 1906 г. На з'езд была запрошана і дэлегацыя "Союза русских людей", створанага праваслаўным духавенствам у кастрычніку 1905 г. пры Богаяўленскім брацтве Магілёва. У першы дзень з'езда з прывітаннем выступіў дэлегат саюза святар Счэнсновіч, які азнаёміў прысутных са станам манархісцкага руху ў Магілёўскай губерні. Прывітальную тэлеграму на адрас з'езда накіравала і манархісцкая арганізацыя "Истинно русские люди г. Орши". Дэлегацыя магілёўскіх манархістаў прыняла ўдзел у падрыхтоўцы прывітальнага ўсёпадданейшага адраса ад імя з'езда цару Мікалаю II, за што ў адказ атрымала разам з іншымі падзяку самадзержца[28].

II (аб'яднаўчы) з'езд адбыўся ў Маскве 6—12 красавіка 1906 г. Ад беларускіх губерняў у яго рабоце ўдзельнічалі прадстаўнікі Гомельскай партыі патрыётаў і Віленскага аддзела "Русского собрания". Аднак з-за разыходжанняў у ацэнцы стратэгіі і тактыкі манархісцкіх партый адносна І Дзяржаўнай думы II з'езд, як і першы, не прывёў крайне правыя сілы да аб'яднання. Тым не менш на з'ездзе канчаткова аформілася пазіцыя манархістаў у адносінах да Дзяржаўнай думы: яны аб'явілі ёй бязлітасную вайну і запатрабавалі неадкладнага роспуску.

У сувязі з новымі выбарамі ў Дзяржаўную думу правыя партыі 2—7 кастрычніка 1906 г. правялі ў Кіеве свой III з'езд. Запрашэнні для ўдзелу ў пасяджэннях з'езда былі накіраваны ў 9 гарадоў Беларусі: Бабруйск, Вільню, Гомель, Мінск, Магілёў, Оршу, Пінск, Рэчыцу, Рагачоў. У спісах дэлегатаў, што прыбылі на з'езд, нам удалося выявіць прадстаўнікоў ад Гомельскага (А.Х.Давыдаў), Аршанскага (С.Ф.Мончыкаў) і Пінскага (Ф.Ф. Баран) аддзелаў "Союза русского народа", а таксама чатырох прадстаўнікоў (Дамарат, Пігулеўскі, Катоўскі, Сурмач) ад Бабруйскага патрыятычнага таварыства "За веру, царя и Отечество"[29]. III з'езд прыняў рашэнне пра аб'яднанне ўсіх манархісцкіх сіл. Для кіраўніцтва рухам у перыяд паміж з'ездамі была створана Галоўная ўправа аб'яднаных рускіх людзей у складзе трох чалавек: князя М.Л.Шахоўскага ад "Русского собрания", А.І.Дубровіна ад "Союза русского народа" і протаіерэя І.І.Васторгава ад "Русского монархического союза". Гэтыя тры партыі захоўвалі самастойнасць, іх мясцовыя арганізацыі атрымалі аўтаномію ў адносінах да ўказанняў Галоўнай управы. Прыняцце агульнай для ўсіх саюзаў праграммы было прызнана дачасным. Такім чынам, і на гэтым з'ездзе поўнага аб'яднання манархісцкіх сіл не адбылося.

IV Усерасійскі з'езд рускіх людзей адбыўся з 26 красавіка па 1 мая 1907 г. напярэдадні паражэння першай рускай рэвалюцыі. Перад гэтым, 19 красавіка, "Русское собрание" і "Союз русского народа" распусцілі Галоўную ўправу, заявіўшы пра аб'яднанне і стварэнне сумеснага органа кіравання. Звестак пра ўдзел у рабоце IV з'езда прастаўнікоў беларускіх манархісцкіх арганізацый выявіць не ўдалося. Аднак у інфармацыйным пісьме вышэйшага органа "Союза русского народа" — Галоўнага савета — ад 31 мая 1907 г. ёсць указанне пра рассылку рашэнняў з'езда ў 71 губерню, у тым ліку ў Вільню, Віцебск, Магілёў і Мінск. У гэтай сувязі можна зрабіць вывад пра ўдзел у падрыхтоўцы і рабоце з'езда таксама і беларускіх манархістаў[30].

Пасля паражэння першай рускай рэвалюцыі 1905—1907 гг. звесткі пра дзейнасць Віленскага аддзела "Русского собрания" вельмі рэдкія і скупыя. Паводле даных Ю.Кір'янава, колькасць членаў "Русского собрания" ў цэлым на тэрыторыі Расійскай імперыі ў другой палове 1914—1915 г. складала ўсяго каля 500 чалавек. З беларускіх гарадоў, дзе меліся яго прадстаўнікі, упамінаецца толькі Гомель[31].

У спісах членаў "Русского собрания" за другую палову 1914 — першую палову 1915 г. значацца ўсяго два чалавекі — былы старшыня (1906 г.) Віленскага аддзела П.П.Шпот (у тэксце Шкот. — **К.Б.**), які на той момант з'яўляўся камергерам (прыдворны чын), стацкім саветнікам, пражываў у г. Гельсінгфорс, працаваў у канцылярыі генерал-губернатара, і М.К.Кастрыцкая, дваранка, пражывала ў Гомелі на вуліцы Ліпавая, дом 4[32].

Згортванне актыўнай дзейнасці "Русского собрания" — палітычнай арганізацыі крайне правых манархістаў — адбылося пасля таго, як 29 студзеня 1914 г. агульны сход выключыў са статута пункт "ж" артыкула 3 і тым самым вярнуў яе дзейнасць "...на прежний путь спокойной академической работы"[33]. З гэтага часу і да роспуску ў сакавіку 1917 г. "Русское собрание" ўяўляла сабой невялікую арганізацыю аматараў і захавальнікаў традыцыйных асноў рускай культуры і побыту.

---

1 Спирин Л.М. Крушение помещичьих и буржуазных партий в России (Начало XX в. — 1920 г.). М., 1977. С. 157.

2 Программы политических партий России. Конец XIX — начало XX в. М., 1995. С. 419.

3 Из истории общественно-политических движений и партий России и СССР. Кн. I. М., 1990. С. 39; Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (далей — ДАРФ). Ф.102.00.1906 г., воп. 236, спр.186, арк. 4.

4 Кирьянов Ю.И. Русское Собрание 1900—1917. М., 2003. С. 8.

5 Программы политических партий России. Конец XIX—начало XX в. С. 419.

6 Там жа. С. 422.

7 ДАРФ. Ф.102.00.1906 г., воп. 236, спр. 186, арк. 17, 43.

8 Шестая годовщина РНС имени Михаила Архангела. СПб., 1914. С. 5; Национальная правая прежде и теперь. Вып.1. СПб., 1992. С.8—9; Открытое письмо ряда правых деятелей членам Русского собрания // Правые партии. Документы и материалы: В 2 т. Т. 2. М., 1998. С. 99.

9 Кирьянов Ю.И. Русское Собрание 1900—1917.

10 Там жа. С. 6—7, 38, 54, 81, 94, 97, 99, 102, 208, 259.

11 Правые и конституционные монархисты в России в 1907—1908 гг. (Вступительная статья Ю.И.Кирьянова) // Вопросы истории. 1997, № 6. С. 108.

12 Из истории общественно-политических движений и партий России и СССР. Кн.1. С. 39.

13 ДАРФ. Ф. 102.00.1906 г., воп. 236, спр. 186, арк. 49—82.

14 Там жа.

15 История политических партий России / Под ред. А.И.Зевелева. М., 1994. С. 64.

16 История России: Справочное пособие / Авт.-сост. И.Н.Кузнецов. Мн., 2000. С. 34—36.

17 Кирьянов Ю.И. Русское Собрание 1900—1917. С. 4; ДАРФ. Ф. 116, воп. 1, спр. 44, ч. 1, арк. 44.

18 ДАРФ. Ф. 588, воп. 3, спр. 25, арк .32.

19 Там жа. Воп. 1, спр. 1243, арк .1—4 адв., 25.

20 Там жа. Ф. 102.00.1906 г., воп. 236, спр. 186, арк. 6.

21 Там жа. Спр. 828, ч. 6, арк. 1—2.

22 Забаўскі М.Дзяржаўная дума // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.3. Мн., 1996. С. 241.

23 О создании Союза русских организаций Западного Края // Окраины России. 1906, № 33. С. 548.

24 Там жа.

25 Сергеевский Н.Д. Русское общественное собрание // Окраины России. 1908, № 35— 36. С. 503.

26 Правые партии: Документы и материалы: В 2 т. Т. 1. М., 1998. С. 678—679, 689—690.

27 Обозрение событий // Окраины России. 1906, № 34. С. 579.

28 Правые партии: Документы и материалы. Т. 1. С. 124—125, 652—653.

29 Там жа. С. 148, 156, 205, 208.

30 Там жа. С. 336.

31 Кирьянов Ю.И. Русское Собрание 1900—1917. С. 81.

32 Там жа. С. 328, 338.

33 Там жа. С. 60.